УДК 947.6 «1941–1944»

**І.У. Нікалаева**

# Выкарыстанне нямецкімі акупантамі працы жаночага насельніцтва Беларусі ў мясцовай вытворчасці і на прымусовых работах (1941–1944 гг.)

Эксплуатацыя мясцовых працоўных рэсурсаў з'яўлялася адной з галоўных задач нямецка-фашысцкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі. Неад'емнай часткай нацысцкай гаспадарчай практыкі на беларускай тэрыторыі стала выкарыстанне працы жаночага насельніцтва рэгіёна ў інтарэсах нямецкай ваеннай эканомікі, акупацыйнай адміністрацыі і часцей вермахта. У прадстаўленым артыкуле зроблена спроба прааналізаваць асноўныя накірункі і этапы германскай працоўнай палітыкі ў дачыненні да жанчын на часова захопленай тэрыторыі Беларусі. Асноўнымі крыніцамі, на якіх грунтуюцца аўтарскія меркаванні, з'яўляюцца апублікаваныя і архіўныя дакументы, а таксама працы айчынных гісторыкаў.

Да эксплуатацыі працы жанчын гітлераўцы прыступілі з першых дзён акупацыі Беларусі. Распараджэннем рэйхсміністра акупаваных усходніх зямель А. Розенберга ад 5.08.1941 г. уводзілася абавязковая працоўная павіннасць для

усяго мясцовага насельніцтва ва ўзросце ад 18 да 45 год, у тым ліку і жанчын. Пры гэтым у распараджэнні падкрэслівалася, што рэйхскамісары маглі для пэўных груп жыхарства пашыраць або абмяжоўваць абавязак да працы [1]. У выніку ўзроставыя рамкі працоўнай павіннасці карэкціраваліся на месцах і пашыраліся на жанчын ад 15- да 55-гадовага ўзросту [1, спр. 8, арк. 8; 2].

Спецыяльна створаныя аддзелы і біржы працы павінны былі ў кароткі тэрмін правесці статыстычны ўлік усіх жыхароў акупаваных тэрыторый, асобна вылучыўшы іх працаздольную частку. Пры гэтым прадугледжвалася размежаванне катэгорый рабочай сілы па полу. Так, у Вілейцы восенню 1941 г. улік працаздольных праводзіўся двума пасрэдніцкімі бюро: мужчынскім і жаночым [3]. З мэтай прадухіліць магчымасць нез'яўлення насельніцтва на рэгістрацыю ўсталёўваліся штрафныя меры пакарання. Планавалася, што ў генеральнай акрузе Беларусь пасля ўсеагульнага ўліку грамадзянскага насельніцтва працаздольныя жанчыны складуць 428 тысяч чалавек ці больш за 60% усіх працаздольных. У гэтыя падлікі не ўваходзілі жанчыны яўрэйскай нацыянальнасці. Па даных бірж працы, у генеральнай акрузе да гэтага часу было 17400 яўрэек, якіх разлічвалася прыцягнуць да работы [4].

Рэгістрацыя жаночага насельніцтва і ўдакладненне папярэдніх даных аб колькасці працаздольных жанчын узмоцнена праводзілася ў 1942 г., калі ва ўмовах зрыву планаў «маланкавай вайны» і складанага ўнутрыэканамічнага становішча ў рэйху кіраўніцтва Германіі вымушана было звярнуцца да больш шырокага выкарыстання працоўных рэсурсаў усходніх акупаваных тэрыторый як у мясцовай, так і германскай вытворчасці. На тэрыторыі Мінскай акругі збор статыстычных даных на пачатку 1942 г. праводзіўся ў некалькі этапаў. Спачатку, з 19.01.1942 г. па 26.01.1942 г., біржы працы павінны былі сабраць звесткі аб беспрацоўных працаздольных мужчынах, пасля чаго неабходна было распачаць рэгістрацыю жанчын, якая павінна была закончыцца да 02.02.1942 г. Жаночая рабочая сіла падлягала ўліку ад 15 да 50 год. У першую чаргу зарэгістравацца павінны былі тыя працаздольныя жанчыны, якія да вайны ўжо працавалі па якой-небудзь спецыяльнасці. Жанчын, якія мелі двое і больш дзяцей да 14-ці год, біржам працы прадпісвалася «пакуль што» не ўлічваць [5]. Заўважым, што рэйхскамісары былі ўпаўнаважаны вызваляць ад абавязку рэгістравацца на біржах цяжарных і адзінокіх жанчын з дзецьмі [5, спр. 503, арк. 505]. Сітуацыя змянілася ў другой палове 1942 г., калі нямецкая акупацыйная адміністрацыя сутыкнулася з цяжкасцямі ў справе забеспячэння мясцовай эканомікі рабочай сілай. Гэта было звязана з распачатай вясной 1942 г. вярбоўкай насельніцтва Беларусі на работы ў рэйх, а таксама інтэнсіўным аднаўленнем мясцовай прамысловай і рамеснай вытворчасці з мэтай уключэння яе ў сістэму эканамічнага забеспячэння Германіі і яе ўзброеных сіл. Так, у кастрычніку 1942 г. на падставе заявак біржам працы ў Генеральным камісарыяце Беларусь была падлічана сярэднямесячная патрэба ў працоўнай сіле, якая складала 31500 чалавек, з іх каля 27% жанчын, а накіравана на работу – толькі 20 тысяч. Пры гэтым незадаволеныя за месяц заяўкі біржам працы на жаночую працоўную сілу склалі 1,5 тысяч [3, спр. 955, арк. 103].

Ва ўмовах кадравага голаду, які ўзнік на акупаванай тэрыторыі, германскія ўлады ўсё больш пачалі схіляцца да пашырэння практыкі выкарыстання працы жаночага насельніцтва ў мясцовай вытворчасці. Так, найбліжэйшы памочнік рэйхсміністра па занятых усходніх абласцях маёр Мюлер, аналізуючы катастрафічную сітуацыю з мясцовай рабочай сілай у аператыўнай зоне «Цэнтр», у справаздачы А. Розенбергу 8.10.1942 г. адзначаў: «Жанчын гэтай

краіны можна разглядаць як паўнацэнную рабочую сілу, таму што яны не толькі прывыклі да цяжкіх мужчынскіх работ, але і больш старанныя за мужчын» [3, спр. 973, арк. 43–44]. У сувязі з гэтым біржамі працы пачалі ўлічвацца жанчыны, «занятыя дзецьмі або хатнімі абавязкамі, якія не падлягалі раней рэгістрацыі» [6].

Аддзелы працоўнага кіравання падзялялі мясцовых жанчын на тых, якія мелі сем'і, і на тых, якія не былі замужам, апошніх можна было лёгка накіроўваць на любыя работы на тэрыторыі Беларусі, а таксама ў Германію. Рэгістрацыя на біржах прадугледжвала абавязковае ўказанне жанчынамі іх спецыяльнасці. У далейшым акупацыйныя ўлады фіксавалі колькасць працаздольнага насельніцтва па прафесійных групах. Да прыкладу, у Мінскай акрузе ўлік працаздольных жанчын ажыццяўляўся ў адпаведнасці з агульнапрынятым спісам груп прафесій для прызначэння на работы, што ўключаў у сябе 28 пунктаў, кожны з якіх утрымліваў пералік канкрэтных спецыяльнасцяў, аб'яднаных у дадзенай групе. Так, сярод спецыялістаў транспарту асобна вылучаліся вагонаважатыя, кандуктары, шафёры, стрэлачніцы і г.д. [5, арк. 247–253; спр. 403, арк. 6]. Такая дэталёвая статыстыка па прафесіях дазваляла аператыўна рэагаваць на запыт гарадскіх (раённых) упраўленняў, нямецкіх воінскіх часцей, разнастайных грамадзянскіх устаноў і арганізацый, а таксама зацікаўленых прадпрыемстваў аб рабочых канкрэтных спецыяльнасцяў.

Маштаб, формы і ўмовы скарыстання працы жаночага насельніцтва залежалі ад эканамічнага патэнцыялу канкрэтнага рэгіёна і асаблівасцей нацысцкай палітыкі ў разнастайных зонах акупацыі. Мерапрыемствы акупацыйных улад былі накіраваны на максімальнае выкарыстанне кваліфікаванай працоўнай сілы галоўным чынам на прадпрыемствах ваеннага характару, а таксама ў вытворчасці, арыентаванай на армейскія патрэбы. Аднаўляліся ў першую чаргу такія галіны, як энергетычная гаспадарка, жалеза- і металаапрацоўка, скураная і шкляная індустрыя, хімічная вытворчасць, дрэваапрацоўка і інш. Заўважым, што асноўную частку кваліфікаваных спецыялістаў у гэтым сектары эканомікі заўсёды традыцыйна складалі мужчыны, тады як даваенная структура жаночай занятасці ў БССР характарызавалася перавагай жанчын у сферы абслугоўвання, а таксама культуры і адукацыі. Гэта ў значнай ступені прадвызначыла становішча на рынку працы ва ўмовах акупацыі і прывяло да таго, што менавіта жаночае насельніцтва з'яўлялася тым патэнцыяльным кантынгентам, які ў першую чаргу прыцягваўся да прымусовых работ.

Аналіз архіўных крыніц дазваляе вылучыць наступныя накірункі прымусовых работ, дзе выкарыстоўвалася праца жанчын. Спецыфічнай формай працоўнага прымусу стала прыцягненне жаночага насельніцтва да работ, якія праводзіліся па непасрэдным забеспячэнні баявых дзеянняў вермахта ў прыфрантавой паласе – будаўніцтве ліній умацаванняў і абарончых пазіцый. Пры гэтым нямецкія спецслужбы кіраваліся «указаннем» рэйхсфюрэра СС Г. Гімлера, які, выступаючы 4.10.1942 г. перад групай генералаў у Познані, адзначыў: «Ці загіне дзесяць тысяч рускіх баб ад знясілення пад час рыцця процітанкавых равоў, мяне не цікавіць. Для мяне значна толькі адно – калі роў будзе закончаны для Германіі» [7]. У межах працоўнай павіннасці жаночае насельніцтва, нараўне з мужчынскім, шырока прыцягвалася да работ па будаўніцтве і падтрыманні ў рабочым стане сеткі камунікацый у кантралюемых немцамі раёнах, што з узмацненнем партызанскай барацьбы станавілася першаснай задачай акупацыйных органаў. Даволі распаўсюджаным было выкарыстанне жанчын на работах па ўборцы памяшканняў, добраўпарадкаванні

і падтрыманні ў чысціні вуліц, у тым ліку ачыстцы іх ад снегу і лёду ў зімні перыяд. Жанчыны, праца якіх цанілася вельмі танна, шырока выкарыстоўваліся ў парадку абавязковай працоўнай павіннасці на прадпрыемствах у якасці чорнарабочых. Асабліва масавым была эксплуатацыя іх працы на торфаздабычы. Абмежавана, галоўным чынам пры адсутнасці дастатковай колькасці мужчынскай рабочай сілы, мясцовае жаночае насельніцтва прыцягвалася таксама да работ у лясной гаспадарцы.

Важнейшым накірункам эксплуатацыі жаночай працоўнай сілы было прыцягненне іх да прымусовай працы ў мясцовай сельскай гаспадарцы. Гэта стала асноўнай формай выкарыстання вясковага жаночага насельніцтва, якое складала пераважную большасць у параўнанні з гарадскім. Па даных на 1940 г., у цэлым у сельскай мясцовасці пражывала 79% насельніцтва Беларусі. На падставе звестак аб працуючых жанчынах Мінскага раёна на 01.12.1942 г. можна скласці ўяўленне аб структуры занятасці гэтай групы насельніцтва. Сярод 7248 працуючых жанчын каля 75% займаліся сельскай гаспадаркай, 6,5% з'яўляліся работнікамі медыцыны, адукацыі і мастацтва, 6% – сферы паслуг, 4,1% працавалі падсобнымі рабочымі, 3,7% былі занятыя ў прамысловай і рамеснай вытворчасці, прычым абсалютная большасць з іх мела спецыяльнасці, звязаныя з пашывам адзення і абутку. Больш за 3% складалі служачыя грамадскіх аб'яднанняў і работнікі сферы гандлю, 0,3% з'яўляліся інжынерна-тэхнічнымі работнікамі [5, спр. 403, арк. 3].

У асабліва цяжкім становішчы апынуліся яўрэйскія жанчыны. Нацысцкая палітыка генацыду, якая праводзілася акупацыйнымі ўладамі ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва, прадугледжвала інтэнсіўнае выкарыстанне працы яўрэяў на самых знясільваючых і нізкааплочваемых работах да «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання», г.зн. татальнага знішчэння яўрэяў. Так, напрыклад, яўрэйскія жанчыны, вязніцы Мінскага гета, прыцягваліся да бруквання двара турмы камянямі, якія трэба было насіць, разбіваць і ўкладваць [8].

Абвешчаная фюрэрам у 1943 г. татальная мабілізацыя ў рэйху матэрыяльных і людскіх рэсурсаў знайшла працяг у палітыцы масавай дэпартацыі працоўнай сілы з акупаваных тэрыторый. У выніку чаго прадпрыемствы, якія дзейнічалі ў Беларусі, пачалі адчуваць востры недахоп рабочых рук. У пошуку новых крыніц папаўнення працоўных рэсурсаў акупацыйная адміністрацыя рэкамендавала кіраўнікам усіх устаноў і прадпрыемстваў прыцягваць жанчын да работ, якія раней выконваліся мужчынамі [9]. У гэтай сувязі германскія ўлады выкарыстоўвалі розныя спосабы для таго, каб задзейнічаць яшчэ не занятых па розных прычынах працаздольных жанчын. Аб'ектам самага пільнага нагляду сталі хатнія гаспадыні, якія мелі на выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту. Значнае распаўсюджванне на гарадскіх прадпрыемствах атрымала практыка задзейнічання жанчын-маці на няпоўным рабочым дні [3, арк. 185]. Згодна з распараджэннямі генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ і камандуючага армейскай вобласцю генерала М. Шэнкендорфа ў гарадах для нагляду за дзецьмі, па прычыне наяўнасці якіх працаздольныя жанчыны не маглі быць выкарыстаны на рабоце, рэкамендавалася арганізоўваць дзіцячыя сады і яслі [1, ф. 2074, воп. 13, спр. 2, арк. 74; 5, спр. 1, арк. 145].

Эксплуатацыя жаночай працы ў сувязі з усё больш відавочным недахопам мужчынскай рабочай сілы набыла выключнае значэнне з другой палоавы 1943 г., калі Чырвоная Армія, разгортваючы наступленне, наблізілася да тэрыторыі Беларусі, і да поўнага яе вызвалення. Загадам камандавання групы армій «Цэнтр» усё жаночае насельнітва ва ўзросце ад 14 да 65 год абязвалася фак-

тычна да неабмежаванага адбывання прымусовых работ на акупантаў [7, с. 92–96]. З мэтай папаўнення працоўных рэсурсаў на акупаванай тэрыторыі выкарыстоўваліся выключныя меры па захопу працаздольнага насельніцтва пад час правядзення карных аперацый супраць партызан. Захопленыя ў ходзе такіх аперацый жанчыны павінны былі накіроўвацца ў якасці працоўнай сілы ў рэйх ці на прымусовыя работы ў межах Беларусі, галоўным чынам у аператыўным тыле. Так, пад час правядзення летам 1944 г. шэрагу аперацый супраць партызан на тэрыторыі 3-й танкавай арміі групы армій «Цэнтр» з 5015 жанчын, пакінутых для выкарыстання ў якасці працоўнай сілы на акупаванай тэрыторыі, 1710 былі перададзены «Арганізацыі Тодта», 2241 накіраваны на будаўніцтва абарончых рубяжоў, 637 – чыгуначных ліній [7, с. 356].

Такім чынам, германскія ўлады разглядалі жаночае насельніцтва Беларусі ў якасці важнай крыніцы папаўнення працоўных рэсурсаў. У палітыцы акупантаў у сферы выкарыстання працы мясцовых жанчын можна вылучыць некалькі этапаў, звязаных са станам развіцця падзей на савецка-германскім фронце, унутрыэканамічнай сітуацыяй у рэйху і становішчам на рынку працы на акупаванай беларускай тэрыторыі. На першым этапе гэтай палітыкі (1941 – першая палова 1942 г.) жаночай працоўнай сіле адводзілася дапаможная роля ў функцыянаванні ствараемых гаспадарчых структур, якія забяспечвалі патрэбнасці вермахта і таксама мясцовых грамадзянскіх кіраўніцтваў. Другі этап (другая палова 1942 – першая палова 1943 г.) характарызуецца пашырэннем практыкі выкарыстання працы жаночага насельніцтва ў мясцовай вытворчасці і на прымусовых работах. Трэці этап (другая палова 1943–1944 гг.) звязаны з максімальнай эксплуатацыяй жаночых працоўных рэсурсаў у інтарэсах ваеннай эканомікі фашысцкай Германіі і яе ўзброеных сіл.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці***, ф. 2290, воп. 1, спр. 105, арк. 29.
2. ***Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці***, ф. 859, воп. 1, спр. 3, арк. 6.
3. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь***, ф. 4683, воп. 3, спр. 978, арк. 170.
4. ***Белорусские остарбайтеры.*** Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944): Документы и материалы. В 2 кн. Кн. 1 (1941–1942). – Мн., 1996. – С. 70–71.
5. ***Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці***, ф. 623, воп. 1, спр. 173, арк. 229, 244.
6. ***Беларуская газэта***, 1942, 9 жніўня.
7. ***Белорусские остарбайтеры.*** Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944): Документы и материалы. В 2 кн. Кн. 2 (1943–1944). – Мн., 1997. – С. 234.
8. ***Иоффе Э.Г.*** Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941–1945. – Мн., 2003. – С. 234.
9. ***Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці***, ф. 2733, воп. 1, спр. 59, арк. 11.



## *S U M M A R Y*

*The article deals with the issue of using Belarusian female labour resources by German occupation authorities during the years of 1941–1944. The main directions and stages of such exploitation on the temporarily occupied Belarusian territory are analyzed in the article.*



*Поступила в редакцию 23.11.2004*